# Аб выстаўцы творчых работ выкладчыкаў Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К. Глебава “Паліфанія”



10.04.2013

11 красавіка а 16-й гадзіне ў галерэі “Панарама” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбудзецца адкрыццё выстаўкі “Паліфанія”, дзе будуць прадстаўлены творчыя работы выкладчыкаў Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К.Глебава.

У экспазіцыю ўвайшлі творы жывапісу, графікі і скульптуры розных гадоў, аўтарамі якіх з’яўляюцца тыя выкладчыкі каледжа, што працуюць у ім сёння. У выстаўцы прынялі ўдзел розныя пакаленні мастакоў: і больш сталыя, вопытныя (Святлана Кастрыца, Вікторыя Кульваноўская, Алег Хартановіч, Святлана Чэпік, Яўген Колчаў, Міхась Яршоў) і тыя, хто прыйшоў працаваць у каледж зусім нядаўна, амаль адразу пасля атрымання дыплому прафесійнага мастака (Марына Гарахавік-Лабуда, Юрый Брэль, Андрэй Карпянкоў, Вікторыя Качэня, Павел Хадаровіч, Дар'я Шышкова, Ганна Інькова.

Ідэя выстаўкі звязана з тэмай паліфаніі: адначасовага гучання, развіцця і ўзаемадзеяння некалькіх раўнапраўных галасоў у межах адной мелодыі. І сапраўды, мастакоў, якія выкладаюць у мастацкім каледжы, аб’ядноўвае шмат фактараў: многія з іх самі былыя выпускнікі “Глебаўкі”, гэта тыя людзі, хто стаўшы прафесіяналам і знайшоўшы свой шлях у мастацтве, шчыра імкнуцца данесці каштоўныя веды да моладзі. Удзельнікі выстаўкі — творцы, працуючыя ў розных відах і жанрах выяўленчага мастацтва, але захаваўшыя досыць рамантычнае стаўленне да рэчаіснасці. “Паліфанія” дэманструе цікавую акалічнасць: работы мастакоў разнастайныя па стылістыцы, але тым не менш іх аб’ядноўвае аднолькавая ступень рэалістычнасці.

На выстаўцы можна сустрэць і мяккія беларускія краявіды, і філасофскія работы, і кампазіцыі, звязаныя з вывучэннем структуры прасторы і рэчаў, работы, пабудаваныя на беларускім этнаграфічным матэрыяле.

Выстаўка “Паліфанія” мае вялікае значэнне і для навучэнцаў мастацкага каледжа. Успрыняцце выкладчыкаў праз прызму іх творчасці здольна значна палепшыць узаемаразуменне, узмацніць аўтарытэт настаўнікаў.

Дадзеная экспазіцыя – яшчэ адна цаглінка ў будаўніцтве такіх важных для нашай краіны паняццяў як “нацыянальная школа жывапісу, скульптуры, графікі.”.